ЗША надалей зьмякчаюць санкцыі ў дачыненьні да двух беларускіх прадпрыемстваў

Таваразварот Беларусі з Расеяй скараціўся на 50%

Моладзеваму актывісту Максіму Дашуку пагражае да 3 гадоў турмы

Рост коштаў у Беларусі аказаўся самым высокім сярод постсавецкіх краінаў

Нумар «ARCHE» прызналі «экстрэмісцкім»

Квартал XII—XIII стагодзьдзяў знайшлі археолягі ў гістарычным цэнтры Менску



photo.bymedia.net

Фінансава-эканамічнае становішча Беларусі працягвае пагаршацца. Прычым незалежныя экспэрты мяркуюць, што афіцыйная статыстыка прыхарошвае сытуацыю. Насамрэч валавы ўнутраны прадукт за студзень ня вырас на 4,2%, як абвесьціў Нацыянальны статыстычны камітэт (Белстат), а зьнізіўся прыкладна на 5%, лічыць незалежны эканаміст Аляксандар Чубрык. Свае разьлікі ён абгрунтаваў у артыкуле, які надрукаваў тыднёвік «Наша Ніва».

Падзеньне ж ВУП на 5%, зазначае Чубрык, «ставіць Беларусь у адзін шэраг з праблемнымі краінамі Эўропы. Крызыс зачапіў Беларусь больш, чым Расею, Польшчу ці Летуву».

Яшчэ адна выснова аўтара палягае ў тым, што такі значны тэмп скурчваньня гаспадаркі зь вялікай імавернасьцю прывядзе да патрэбы далейшага зьмяншэньня бюджэтных расходаў і новай дэвальвацыі рубля.

Варта дадаць, што паўзучая дэвальвацыя і так ідзе. Пасьля шокавага абвалу на 20,5% на самым пачатку году беларускі рубель за два месяцы спакваля патаньнеў адносна даляра яшчэ на 8%.

Прэзыдэнт Лукашэнка нядаўна мусіў публічна прызнацца, што прамысловае лобі прапануе дэвальваваць нацыянальную валюту дадаткова на 20%. А першы віцэ-прэм’ер Уладзімер Сямашка 20 лютага заявіў, што «памяркоўная і разумная дэвальвацыя нацыянальнай валюты для экспартаарыентаванай краіны з адкрытай эканомікай спрыяе абароне ўласнага рынку ды стымулюе экспарт».

Найперш маецца на ўвазе неабходнасьць падвысіць канкурэнтаздольнасьць беларускай




прадукцыі на расейскім рынку, бо зараз расейскі рубель слабее хутчэй, чым беларускі.

Крызыс прывёў да таго, што тавараздварот паміж Беларусьсю і Расеяй сёлета ў студзені зьнізіўся на 40–50% у параўнаньні з такім жа леташнім пэрыядам. Пра гэта заявіў 25 лютага першы намесьнік міністра замежных справаў Беларусі Ігар Петрышэнка. Растуць запасы нерэалізаванай прадукцыі на складах прадпрыемстваў. Некаторыя зь іх мусяць пераходзіць на скарочаны працоўны тыдзень, скіроўваць працаўнікоў у неаплатныя адпачынкі. Узмацняецца пагроза беспрацоўя.

Нарастаньне крызысных зьяваў можа выклікаць рост сацыяльнай напружанасьці. Узровень жыцьця насельніцтва ўжо заўважна зьніжаецца. За студзень рост спажывецкіх цэнаў у Беларусі — 4,1% — аказаўся найвышэйшым на ўсім постсавецкім абсягу. Паралельна зьнізіліся заробкі. Паводле Белстату, сярэдняя налічаная зарплата скарацілася з 1 000,2 тыс. руб. у сьнежні да 919,6 тыс. руб. у студзені (на 8,1%). У даляравым эквіваленце падзеньне наагул аглушальнае — з $450 да $330 (на 26,7%).

Аглядальнікі адзначаюць, што гэта ёсьць крахам абяцаньня Лукашэнкі давесьці сярэдні месячны заробак у краіне да 700 даляраў у эквіваленце ў 2010 годзе. На думку эканаміста Леаніда Заікі, насамрэч беларусаў чакае зьніжэньне ўзроўню жыцьця прыкладна на 30%, і гэты спад будзе доўжыцца да 2012 году.

Менавіта суворыя эканамічныя рэаліі змушаюць беларускае кіраўніцтва да нармалізацыі дачыненьняў з Захадам. У прыватнасьці, Менск прыязна ставіцца да новай праграмы ЭЗ «Усходняе партнэрства». Аднак беларускія афіцыйныя асобы падкрэсьліваюць, што хацелі б зьбліжацца з аб'яднанай Эўропай на сваіх умовах — фактычна адсунуўшы ў бок праблемы дэмакратыі ды правоў чалавека.

Між тым сытуацыя з выкананьнем правоў чалавека ў Беларусі летась была вельмі дрэннай. Такую выснову ўтрымлівае абнародаваны днямі штогадовы даклад аб правах чалавека, падрыхтаваны Дзяржсдэпартамэнтам ЗША.

У дакумэнце зазначаецца, што летась беларускія ўлады па-ранейшаму дапускалі «частыя сур'ёзныя злоўжываньні». У прыватнасьці, абмяжоўваліся грамадзянскія правы і свабоды, у тым ліку свабода прэсы, правы на свабоду слова, сходаў, асацыяцый і рэлігіі. Падкрэсьліваецца, што ў краіне «сур'ёзна абмежавана права грамадзянаў на зьмену ўраду».

Таксама адзначаецца, што ў 2008 годзе працягваліся затрыманьні і зьняволеньне тых грамадзян, якія выступалі з крытыкай афіцыйных уладаў. Канстатуецца, што «беларускія органы правапарадку ўжывалі неабгрунтаваную сілу пры разгоне мірных акцый пратэсту; карупцыя працягвае заставацца праблемай; няўрадавыя арганізацыі і палітычныя партыі зазнавалі перасьлед, атрымлівалі штрафы або былі закрытыя».




На думку апазыцыянэраў, сёлета сытуацыя мала зьмянілася, а апошнія тыдні дык і ўвогуле адзначаныя новай хваляй рэпрэсіўных дзеяньняў. У апазыцыйным асяродку лічаць новымі палітвязьнямі арыштаваных у лютым лідэраў прадпрымальніцкага руху Юрыя Лявонава, Мікалая Аўтуховіча ды Ўладзімера Асіпенку з Ваўкавыску (афіцыйна ім вылучаныя абвінавачаньні крымінальнага кшталту), а таксама моладзевага актывіста Арцёма Дубскага. Адзначаецца і жорсткі разгон у Менску вулічных акцыяў 14 і 16 лютага.

У зьвязку з гэтым частка палітычнай апазыцыі скрытыкавала візыт у Беларусь 19 лютага генэральнага сакратара Рады ЭЗ Хаўера Саляны, называючы цяперашнюю палітыку Брусэлю ў беларускім пытаньні непразрыстай, недальнабачнай і нават амаральнай.

24 лютага ў Менску прайшоў брыфінг, падчас якога шэраг апазыцыйных палітыкаў выказалі сваю занепакоенасьць магчымым далучэньнем Беларусі да «Ўсходняга партнэрства» без выкананьня ўмоў датычна дэмакратызацыі.

Як заявіў БелаПАН былы намесьнік міністра замежных справаў Андрэй Саньнікаў, «цяпер Эўразьвяз заплюшчвае вочы на тое, што зьмены ідуць у іншы, нэгатыўны бок, што ў нас ізноў зьявіліся палітзьняволеныя, што разганяюцца мірныя акцыі».

26 лютага прэзыдыюм палітрады Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі таксама заявіў, што ўдзел краіны ва «Ўсходнім партнэрстве» можа быць падтрыманы толькі пры выкананьні Менскам усіх адпаведных умоў.

Са свайго боку, прэсавы сакратар Хаўера Саляны Крысьціна Галах 24 лютага на сустрэчы з журналістамі падкрэсьліла фактычна тое ж: «Беларусь зможа браць удзел у праекце Эўразьвязу «Усходняе партнэрства», толькі калі ўмовы ЭЗ будуць выкананыя». У прыватнасьці, зазначыла яна, у краіне мусяць выконвацца правы чалавека, павінен быць наладжаны дыялёг паміж апазыцыяй і ўрадам, забясьпечаная свабода прэсы.

Тым часам стала вядома, што 12—13 сакавіка Беларусь наведае з афіцыйным візытам эўракамісарка па замежных сувязях і палітыцы добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр. Яна падкрэсьліла важнасьць гэтай паездкі і зазначыла: калі па выніках візыту пацьвердзіцца прагрэс Беларусі ў галіне дэмакратызацыі і выкананьне ўладамі ўмоваў Эўразьвязу, то краіна будзе ўлучаная ва «Ўсходняе партнэрства».

Гэта азначае, што Аляксандар Лукашэнка можа быць запрошаны на ўстаноўчы саміт праграмы, які мае адбыцца 7 траўня ў Празе.

ПАЛІТЫКА

## ЗША надалей зьмякчаюць санкцыі ў дачыненьні да двух беларускіх прадпрыемстваў



photo.bymedia.net

***Міністэрства фінансаў ЗША падоўжыла да 1 чэрвеня 2009 году рашэньне пра зьмякчэньне санкцыяў у адносінах да двух беларускіх прадпрыемстваў – «Лакафарба» і «Полацак-Шкловалакно».***

Гэтыя заводы ўваходзяць у склад канцэрну «Белнафтахім». Паводле дакумэнту, амэрыканскім грамадзянам дазволена супрацоўніцтва з гэтымі прадпрыемствамі. У той жа час уласнасьць заводаў застаецца заблякаванай.

«Амэрыканцам таксама забаронена праз або пры пасярэдніцтве прадпрыемстваў «Лакафарба» і «Полацак-Шкловалакно» купляць прадукцыю, паслугі і тэхналёгіі ў іншых суб'ектаў гаспадараньня, занесеных у сьпіс», – падкрэсьліваецца ў паведамленьні Мінфіну.

*БелаПАН*

АФІЦЫЙНА

## Тавараабарот Беларусі з Расеяй скараціўся на 50%


photo.bymedia.net

***Пра гэта заявіў першы намесьнік міністра беларускага МЗС Ігар Петрышэнка на сустрэчы з кіраўнікамі працоўных групаў Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парлямэнтамі замежных дзяржаваў.***

«На жаль, па выніках студзеня па аб'ектыўных і дзесьці суб'ектыўных прычынах тавараабарот з Расеяй зьнізіўся на 40–50% у параўнаньні са студзенем-лютым мінулага году», – адзначыў І. Петрышэнка.

Кажучы пра стан гандлёва-эканамічных адносінаў з Эўрапейскім Зьвязам, першы намесьнік міністра адзначыў, што ва ўмовах эканамічнага крызысу сёньня «кожны спрабуе захаваць сваю эканоміку». «Намі прымаюцца меры, каб наступствы крызысу не былі такімі

ўражальнымі», – сказаў І. Петрышэнка. Паводле ягоных словаў, «сёньня няма такой краіны ў сьвеце, якую б не закрануў глябальны фінансавы эканамічны крызыс». «Асабліва гэта адчуваецца ў нашай краіне зь яе экспартаарыентаванай эканомікай», – заявіў першы намесьнік міністра замежных справаў Беларусі.

*Хартыя’97*

АПАЗЫЦЫЯ

## Моладзеваму актывісту Максіму Дашуку пагражае да 3 гадоў турмы

***Крымінальная справа распачатая супраць моладзевага актывіста, 17-гадовага Максіма Дашука – удзельніка «працэсу 14-ці». Тады яго асудзілі на паўтара году абмежаваньня волі. Зараз маладзёну высунулі абвінавачваньне ў парушэньні парадку адбываньня пакараньня. Яму пагражае да трох гадоў пазбаўленьня волі, інфармуе «Хартыя’97».***

Як распавёў адвакат Максіма Павал Сапелка, маці актывіста – індывідуальны прадпрымальнік, бацькі – няма. У сувязі зь цяжкім фінансавым становішчам у сям’і Дашук дапамагаў маці па працы. З-за гэтага было зафіксавана каля пяці парушэньняў парадку адбываньня пакараньня.

ЭКАНОМІКА

## Рост коштаў у Беларусі аказаўся самым высокім сярод постсавецкіх краінаў

***Рост спажывецкіх коштаў у Беларусі ў студзені 2009 году аказаўся самым высокім сярод краінаў былога СССР. Прадукты і тавары ў нашай краіне падаражэлі на 4,1%, паведамляе БелаПАН.***




На другім месцы Ўкраіна. Там кошты вырасьлі на 2,9%. На трэцім – Летува, чацьвертым – Расея. А вось у Азэрбайджане, Эстоніі і Малдове кошты, хоць і нязначна, але зьнізіліся.

ГРАМАДЗТВА

## Нумар «ARCHE» прызналі «экстрэмісцкім»

***Суд Маскоўскага раёну Берасьця прызнаў № 7–8 часопісу «ARCHE-Пачатак» «экстрэмісцкімі матэрыяламі, якія падлягаюць зьнішчэньню», тым самым задаволіўшы заяву УКДБ Брэсцкай вобласьці «Аб устанаўленьні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэньне». Слуханьні праходзілі ў закрытым рэжыме і доўжыліся ўсяго гадзіну.***

Справу разглядала судзьдзя Тацьцяна Міранюк. Яшчэ перад пачаткам паседжаньня яна абвясьціла, што працэс будзе адбывацца ў закрытым рэжыме. У сувязі з гэтым у судовым паседжаньні бралі ўдзел толькі прадстаўнік КДБ і адвакат Павал Сапелка, які прадстаўляў інтарэсы адказчыка. У залю суду не дапусьцілі нават заснавальніка «ARCHE» Андрэя Дынько.

Павал Сапелка лічыць, што рашэньне «незаконнае, неабгрунтаванае і падлягае адмене».

Галоўны рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў таксама ўпэўнены, што абвінавачаньні часопісу ў парушэньні закону «Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму» абсалютна беспадстаўныя. «Цяжка знайсьці словы, каб пракамэнтаваць гэтае рашэньне. У часопісе не было ніводнага закліку да гвалтоўных дзеяньняў альбо да падрыву дзяржаўнага ладу. Нумар часопісу займаў 1100 старонак, гэта каля 3 млн. знакаў. З гэтага вялізнага аб’ёму тэкстаў зыскоўцы вырвалі 4 фразы, якія ўяўляюць сабою хутчэй філасофскія разважаньні… Сытуацыя абсурдная. КДБ фактычна перасьледуе іншадумства, як у часы СССР».

*Беларуская асацыяцыя журналістаў*

КУЛЬТУРА

# Квартал XII—XIII стагодзьдзяў знайшлі археолягі ў гістарычным цэнтры Менску




***У Менску каля будынку былога кляштару бэрнардзінаў па вуліцы Кірылы і Мяфодзія археолягі знайшлі гандлёва-рамесны пасад XII–XIII стагодзьдзяў.***

Тут былі дамы купцоў, гандлёвыя склады. У зямлі трапілася шмат алавяных плёмбаў, а значыць, у гэтым месцы ішоў ажыўлены гандаль, інфармуе «Народная газэта».

Такім чынам археолягі даказалі, што Менск у першыя стагодзьдзі свайго існаваньня не абмяжоўваўся адным Замчышчам. Археолягі мяркуюць, што гэта быў квартал «сярэдняга клясу». Ён існаваў дзесьці да XIV стагодзьдзя, а пасьля людзі адсюль сышлі. Магчыма, у нейкі пэрыяд падняўся ўзровень вады ў Сьвіслачы і гараджане перасяліліся ў больш зручныя месцы.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

ERB
EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.